**Лапіна С.В.**, *прафесар*

# РОЛЯ САЦЫЯЛОГІІ Ў СТВАРЭННІ ЦЫВІЛЬНАГА ГРАМАДСТВА НА БЕЛАРУСІ

Вядома, што мова - гэта універсальны сродак існавання культуры. У лексіцы кожнага народа адбіваюцца яго светаўспрыманне і менталітэт. Яшчэ да вылучэння кола пытанняў, якія звязаны з вывучэннем працэсу перабудовы сучаснага беларускага грамадства, у вочы кінулася этымалагічная блізкасць беларускамоўных слоў «цывілізаванае» і «цывільнае» (па-руску - «гражданское») грамадства. Здаецца, што такая сугучнасць тэрмінаў, якія ў расійскай мове не супадаюць па зместу, не выпадковая. Так склалася ў айчыннай гісторыі, што палітычныя, дзяржаўныя адносіны ў грамадстве на Беларусі заўсёды абапіраліся на вайсковую моц. І так адбылося, што большая частка насельніцтва знаходзілася ў яўнай (а яшчэ больш - у патаемнай) апазіцыі, супрацьстаянні адносна існуючых палітычных улад. Мабыць, таму паняцце «цывілізаванае грамадства» ў беларускім менталітэце стала асацыіравацца з непалітычным, недзяржаўным, «цывільным грамадствам».

У адрозненне ад палітычных адносін, якія існуюць у грамадстве, «цывільнае грамадства» - гэта сфера спантаннага самаўвасаблення свабодных індывідаў і дабрачынна ўтвораных асацыяцый і арганізацый грамадзян, якая ахоўваецца неабходнымі законамі ад прамога ўмяшання і адвольнай рэгламентацыі дзейнасці гэтых грамадзян з боку ўстаноў дзяржаўнай улады.

Вывучэнне гістарычнага вопыту развіцця розных народаў дазваляе прыйсці да высновы: узровень цывілізаванасці знаходзіцца ў цеснай сувязі з узроўнем развіцця цывільнага грамадства, у якім жыццядзейнасці грамадзян не звонку кіруецца, а рэгулюецца існуючымі ў грамадстве ўяўленнямі аб свабодзе і адказнасці, аб нормах адносін да іншых членаў грамадства - так званых непасрэдных рэгулятараў паводзін кожнай асобы.

Канкрэтна-гістарычныя рысы кожнага грамадства - яго унікальныя ўласцівасці. Іх нельга назначаць і апісаць раз і назаўсёды.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Менавіта сацыялагічныя даследаванні даюць той стракаты малюнак, які адлюстроўвае складаныя сацыяльныя адносіны ў кожны момант грамадскага жыцця. Пашырэнне сферы сацыялагічнага аналізу, рост колькасці спажыўцоў яго вынікаў, а яшчэ больш - удзельнікаў такіх даследаванняў - гэта прыметы цывільнага і цывілізаванага грамадства.

Адзін са знакамітых сучасных амерыканскіх сацыёлагаў Дж.Н.Смелзер на пытанне: «Што такое сацыялогія?» -адказаў: «Гэта навуковае вывучэнне грамадства». І зацвердзіў сваю думку ў шэрагу навуковых работ і самым папулярным падручніку па сацыялогіі, якім карыстаюцца сёння студэнты ва ўсім свеце.

Трэба і нам засвоіць узоры цывілізаваных адносін да сацыялогіі, што, як сведчыць гістарычны вопыт, ідзе на карысць цывільнаму грамадству. Цывілізаваныя адносіны да сацыялогіі можна практыкаваць на ўсіх узроўнях: ад малой сацыяльнай групы, калектыву да грамадства цалкам. Патрэбна толькі зацікаўленасць у гэтай справе. Зразумела, што выкладаць свае погляды на тыя ці іншыя з'явы грамадскага жыцця і працей, і цікавей - гэтак можна адчуць сябе і знакамітым навукоўцам, і славутым грамадскім дзеячам. Таму, мабыць, некаторыя былыя грамадазнаўцы-марксісты з такой раз'юшанасцю, выступаюць супраць метадалагічных высноў сацыялогіі, якія дазваляюць зразумець, хто ёсць хто ў нашым грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ